# Аб сустрэчы з дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Сербіі



11.04.2012

9 красавіка Пасол Беларусі ў Сербіі Уладзімір Чушаў сустрэўся з дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Сербіі Дэянам Рысцічам, які перадаў падпісанае сербскім бокам пагадненне аб супрацоўніцтве з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі для падпісанне яе кіраўніком.

Беларуская ўстанова будзе першай з галоўных бібліятэк краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў, з якой падпісваецца такі дагавор.

На сустрэчы абмяркоўваліся пытанні абмену кнігамі і іншымі інфармацыйнымі рэсурсамі, уталяванне супрацоўніцтва паміж супрацоўнікамі бібліятэк.

Дэян Рысціч падзяліўся вопытам пасяховай рэстытуцыі сербскіх культурных каштоўнасцей, якія былі вывезены з тэрыторыі Сербіі пад час Першай і Другой сусветнай вайны.

Дасягнуты папярэднія дамоўленасці аб удзеле Дэяна Рысціча ў святкаванні 90-годдзя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якое адбудзецца ў Мінску ў верасні 2012 года.

*па паведамленню Пасольства Беларусі ў Сербіі*